# *§ 41–0. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Барацьба супраць акупантаў

ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА
ПАРТЫЗАНСКІ РУХ
ПАДПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА
«РЭЙКАВАЯ ВАЙНА»
ПАРТЫЗАНСКАЯ ЗОНА
ПАРТЫЗАНСКІ РЭЙД
«ВІЦЕБСКІЯ ВАРОТЫ»
АПЕРАЦЫЯ «БАГРАЦІЁН»

Арганізацыя ўсенароднай барацьбы

**1. Масавая барацьба супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Партызанскі рух і падпольная барацьба на тэрыторыі Беларусі.** Беларускі народ ад першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўзняўся на барацьбу з захопнікамі. У адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, барацьба супраць акупантаў у БССР насіла агульнанародны характар. Яе арганізатарам была Камуністычная партыя. Для нелегальнай працы ў Беларусі ўлетку 1941 г. было пакінута 9 тыс. камуністаў і больш за 5 тыс. камсамольцаў. У час акупацыі на тэрыторыі нашай краіны дзейнічалі падпольныя партыйныя і камсамольскія органы (райкамы, абкамы).

Асноўнымі формамі барацьбы беларускага народа супраць акупантаў былі *партызанскі рух, падпольная барацьба*, а таксама зрыў мірным насельніцтвам, якое не ўваходзіла ў склад партызанскіх фарміраванняў і падпольных груп, эканамічных, палітычных і ваенных планаў акупантаў.

Паводле свайго складу шэрагі партызан былі шматнацыянальныя (беларусы, рускія, украінцы,

## УДЗЕЛЬНІКІ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ Ў БЕЛАРУСІ




Прааналізуйце звесткі з дыяграм. Дакажыце, што барацьба супраць акупантаў у Беларусі была ўсенародная.

предстаўнікі іншых нацыянальнасцей СССР) і рознаўзроставыя.

### Партызанскі рух

Арганізатарамі партызанскага руху выступалі камуністы, беспартыйныя актывісты, ваеннаслужачыя і камандзіры Чырвонай арміі. Сярод вядомых кіраўнікоў партызанскага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі — П. М. Машэраў, А. С. Азончык, У. Е. Лабанок, К. П. Арлоўскі, Ф. Ф. Дуброўскі, Ф. Р. Маркаў, В. І. Казлоў, В. І. Ліўенцаў і інш.

Успомніце:
- прозвішчы кіраўнікоў першых партызанскіх атрадаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі;
- калі быў створаны ЦШПР і хто ім кіраваў.

Для кіравання партызанскім рухам на тэрыторыі Беларусі ў верасні 1942 г. быў створаны *Беларускі штаб партызанскага руху* (БШПР) пад кіраўніцтвам П. З. Калініна.

У разгортванні партызанскай барацьбы важнае значэнне мелі *«Віцебскія (Суражскія) вароты»* — 40-кіламетровы разрыў у лініі фронту на стыку нямецкіх армій «Поўнач» і «Цэнтр», якія ўтварыўся ў выніку контрнаступу Чырвонай арміі ў снежні 1941 г. пад Масквой. Праз «Суражскія вароты»

ў 1942 г. на тэрыторыю БССР, акупаваную ворагам, накіроўвалі зброю, медыкаменты, з акупаванай тэрыторыі выводзілі мірнае насельніцтва.

**Дыверсійная дзейнасць партызан**

Адным з галоўных кірункаў дзейнасці беларускіх партызан была *дыверсійная дзейнасць на чыгунках і шашэйных дарогах, чыгуначных вузлах*. Гэта было невыпадкова. Па тэрыторыі Беларусі праходзілі важныя чыгуначныя і шашэйныя магістралі, што звязвалі тыл Германіі з фронтам. Тут размяшчаліся найбуйнейшыя чыгуначныя вузлы, праз якія забяспечваліся войскі не толькі групы армій «Цэнтр», але часткова і груп армій «Поўнач» і «Поўдзень».

У 1943–1944 гг. з удзелам партызан была праведзена аперацыя па адначасовым масавым разбурэнні чыгуначных камунікацый ворага, вядомая пад назвай *«рэйкавая вайна»*. Яна праводзілася ў тры этапы: першы — у жніўні — верасні 1943 г.; другі (кодавая назва «Канцэрт») — ад сярэдзіны верасня да пачатку лістапада 1943 г.; трэці пачаўся ў ноч на 20 чэрвеня 1944 г. і цягнуўся да поўнага вызвалення Беларусі.

> З якімі падзеямі на савецка-германскім фронце былі звязаныя тры этапы «рэйкавай вайны»?

Народныя мсціўцы мэтанакіравана нападалі на гарнізоны праціўніка. Павелічэнне партызанскіх сіл дазваляла ім не толькі ажыццяўляць аперацыі па вызваленні раённых цэнтраў, але і ўтрымліваць іх і навакольныя населеныя пункты пад сваім кантролем. Першым раённым цэнтрам Беларусі, вызваленым у студзені 1942 г. партызанамі, былі Капаткевічы.

**Партызанскія зоны**

Напрыканцы 1943 г. беларускія партызаны кантралявалі каля 60 % акупаванай тэрыторыі рэспублікі, значная частка якой была цалкам вызвалена ад захопнікаў. На тэрыторыі Беларусі існавала больш за 20 *партызанскіх зон*, сярод іх — Клічаўская, Полацка-Лепельская, Барысаўска-Бягомльская і інш. Тут дзейнічалі абласныя і раённыя камітэты партыі і камсамола, райвыканкамы. У населеных пунктах

аднаўлялі работу сельскія саветы, школы, працавалі невялікія прадпрыемствы і майстэрні, былі пабудаваныя аэрадромы для дастаўкі зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў, адпраўкі параненых і хворых у савецкі тыл. Тут выдавалася каля 170 падпольных газет, працавала 168 радыёстанцый.

### Партызанскія рэйды

У мэтах пашырэння партызанскага руху, дэзарганізацыі дзейнасці акупацыйных улад, збору разведвальнай інфармацыі партызаны праводзілі *рэйды* па тылах праціўніка. Адным з першых быў санны рэйд у сакавіку 1942 г., у ім удзельнічала звыш 400 партызан Мінскай, Пінскай і Палескай абласцей.

Адным з найважнейшых кірункаў дзейнасці патрыётаў з'яўлялася агітацыйна-прапагандысцкая работа з мясцовым насельніцтвам. Партызаны праводзілі гутаркі, сходы, мітынгі, выдавалі і распаўсюджвалі падпольныя газеты, улёткі, якія змяшчалі заклікі да барацьбы з захопнікамі.

Дзейнасць партызан падтрымлівала большасць жыхароў Беларусі. Насельніцтва дапамагала партызанам прадуктамі, адзеннем, зборам і рамонтам зброі. Многія жыхары разам з партызанамі ўдзельнічалі ў баявых і дыверсійных аперацыях.

**Асноўныя кірункі партызанскай барацьбы**

- Партызанская разведка
- Дыверсіі на ваенных аб'ектах
- Разбурэнне камунікацый праціўніка (дарогі, масты, лініі сувязі)
- Сумесныя баявыя аперацыі з Чырвонай арміяй
- Стварэнне партызанскіх зон
- Агітацыйна-прапагандысцкая работа з мірным насельніцтвам
- Знішчэнне варожых гарнізонаў
- Партызанскія рэйды

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, матэрыялы кнігі «Памяць», даведайцеся пра дзеянні партызан на тэрыторыі вашага раёна, вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Асноўныя кірункі падпольнай барацьбы**

- Агітацыйна-прапагандысцкая работа сярод насельніцтва
- Дыверсійна-баявая дзейнасць, арганізацыя масавага сабатажу
- Знішчэнне акупантаў

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, матэрыялы кнігі «Памяць», даведайцеся пра дзейнасць падпольшчыкаў на тэрыторыі вашага раёна, вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

### Антыфашысцкае падполле

У 1942–1943 гг. на акупаванай тэрыторыі Беларусі была створана разгалінаваная сетка падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый. Яны дзейнічалі ў Мінску, Гомелі, Бабруйску, Магілёве, Полацку, Баранавічах, Асіповічах, Віцебску і іншых населеных пунктах рэспублікі.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Г. п. Радашковічы*



*Г. Віцебск*



*Г. Мінск*



*Г. Асіповічы*



*Г. Любань*

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, выканайце заданні.*

1. *Назавіце імёны герояў Вялікай Айчыннай вайны, помнікі якім устаноўлены ў беларускіх гарадах (гл. ілюстрацыі). Які подзвіг яны здзейснілі?*
2. *Як звязаныя помнік у г. Любань і манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі ў г. Жодзіна?*
3. *Імёны якіх герояў Вялікай Айчыннай вайны — воінаў Чырвонай арміі, партызан, падпольшчыкаў — увекавечаны ў назвах вуліц вашага населенага пункта?*

У ноч на 22 верасня 1943 г. удзельніцы Мінскага падполля А. Р. Мазанік, Н. В. Траян і М. Б. Осіпава ажыццявілі аперацыю па знішчэнні генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ. За гэты подзвіг падпольшчыцы былі ўшанаваны званнем «Герой Савецкага Саюза».



*Значок «Горад-герой Мінск». 1976 г.*

Навек упісаныя ў гісторыю імёны мінскіх падпольшчыкаў З. З. Гало, І. К. Кавалёва, Д. А. Караткевіча, М. К. Каржанеўскага, І. І. Матусевіча, Л. Я. Адзінцова і інш. За перыяд акупацыі патрыёты Мінска здзейснілі звыш 1500 дыверсій, знішчылі некалькі тысяч германскіх салдат, афіцэраў і тых, хто супрацоўнічаў з акупацыйнай уладай. Многія мінскія падпольшчыкі былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Восем мінскіх падпольшчыкаў ушанаваныя званнем «Герой Савецкага Саюза», у іх ліку — І. К. Кабушкін, І. П. Казінец, М. А. Кедышка. За мужнасць і гераізм у барацьбе з нацыстамі г. Мінску ў **1974 г.** нададзена званне «горад-герой».

Пад кіраўніцтвам К. С. Заслонава ўдзельнікі Аршанскага падполля толькі ад лістапада 1941 г. да лютага 1942 г. вывелі са строю больш за 170 паравозаў. Адну з найбуйнейшых дыверсій здзейсніў падпольшчык Ф. А. Крыловіч на чыгуначнай станцыі Асіповічы ў ноч на 30 ліпеня 1943 г. — у выніку згарэлі 4 эшалоны, у тым ліку эшалон з новымі танкамі «Тыгр», што рухаўся ў раён Курска (было знішчана 30 танкаў).

Дзейснай формай барацьбы былі дыверсіі на ваенных складах, у сховішчах паліва праціўніка. Падпольшчыкі псавалі абсталяванне прамысловых прадпрыемстваў, знішчалі гатовую прадукцыю. З набліжэннем войскаў Чырвонай арміі патрыёты намагаліся зберагчы каштоўнае абсталяванне, прадухілялі разбурэнне прамысловых прадпрыемстваў.

Шырокую вядомасць атрымалі подзвігі обальскіх падпольшчыкаў. Камсамольская арганізацыя

«Юныя мсціўцы» ў пасёлку Обаль Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці была створана ўвесну 1942 г. Маладыя падпольшчыкі здзейснілі 21 дыверсію. Пасля вайны Зінаідзе Партновай (пасмяротна) і Ефрасінні Зяньковай прысвоена званне «Герой Савецкага Саюза».



*Помнік Обальскаму камсамольскаму падполлю. Г. п. Обаль*

На акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны супраць ворага змагаліся 374 тыс. партызан і больш за 70 тыс. падпольшчыкаў.

**2. Захаванне беларускай дзяржаўнасці ў гады вайны.** Адна з задач нацысцкага кіраўніцтва Германіі заключалася ў знішчэнні савецкай дзяржаўнасці і яе органаў улады. Аднак на працягу ўсяго перыяду Вялікай Айчыннай вайны беларуская дзяржаўнасць, прадстаўленая ўсімі ўзроўнямі дзяржаўнага кіраўніцтва і партыйных органаў, захоўвалася.

У сувязі з германскім наступам улетку 1941 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, СНК БССР і асобныя наркаматы пераехалі ў Магілёў, пасля ў Гомель, а пасля акупацыі тэрыторыі Беларусі — у Маскву.

**Партыйныя органы — арганізатары ўсенароднай барацьбы**

Ва ўмовах акупацыі на тэрыторыі нашай краіны працягвалі працаваць партыйныя органы. Абкамы, гаркамы, райкамы КП(б)Б перайшлі да падпольнай работы, што ахапіла ўсе раёны Беларусі. Пад кіраўніцтвам камуністаў была таксама створана сетка камсамольскіх падпольных арганізацый.

Савецкая ўлада была адноўлена на тэрыторыі партызанскіх зон, там дзейнічалі абкамы і райкамы партыі, выканкамы Саветаў.

**Аднаўленне савецкай улады ў БССР**

З пачаткам вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вышэйшыя органы дзяржаўнай улады вярнуліся ў рэспубліку. 26 лістапада 1943 г. Чырвоная армія вызваліла першы абласны цэнтр БССР — г. Гомель. Неўзабаве сюды з Масквы перамясціліся ЦК КП(б)Б, СНК БССР

## СЯРОД ВЫШЭЙШАГА КІРАЎНІЦТВА БССР ПАСЛЯ ВАЙНЫ БЫЛІ ЧАТЫРЫ ГЕРОІ САВЕЦКАГА САЮЗА



*П. М. Машэраў. Першы сакратар ЦК КПБ (1965–1980)*



*В. І. Казлоў. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (1948–1967)*



*У. Е. Лабанок. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (1976–1977)*



*А. Я. Кляшчоў. Старшыня Савета Міністраў БССР (1948–1953)*

Як вы лічыце, чаму кіраўнікамі рознага ўзроўню ў пасляваеннай БССР рабіліся арганізатары вызваленчай барацьбы? У якіх галінах улады займалі пасады В. І. Казлоў, У. Е. Лабанок і А. Я. Кляшчоў? Назавіце прозвішчы цяперашніх кіраўнікоў гэтых галін улады ў Рэспубліцы Беларусь.



*Дом урада. Г. Мінск. 1944 г.*

і Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР. Ужо ў сакавіку 1944 г. на беларускай зямлі (у гомельскім прадмесці Навабеліца) упершыню за гады вайны адбылася сесія Вярхоўнага Савета БССР. Дэпутатамі былі ваеннаслужачыя, партызаны, падпольшчыкі і працаўнікі савецкага тылу.

Пасля вызвалення Мінска сюды ў сціслыя тэрміны былі пераведзены ЦК КП(б)Б, Прэзідыум Вярхоўнага Савета і СНК БССР.

На заключным этапе вайны беларуская дзяржаўнасць набыла геапалітычную вагу, што знайшло выяўленне ва ўдзеле БССР у стварэнні і дзейнасці пасляваенных міжнародных арганізацый.

Пачатак вызвалення БССР

**3. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» (23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.).** Разгром нацысцкіх войскаў на Курскай дузе, паспяховы наступ Чырвонай арміі стварылі ўмовы для вызвалення Беларусі ад акупантаў. **23 верасня 1943 г.** быў вызвалены першы раённы цэнтр БССР — Камарын, **26 лістапада 1943 г.** — першы абласны цэнтр — г. Гомель.

Усяго ў выніку наступу Чырвонай арміі восенню — зімой 1943–1944 гг. было вызвалена 36 раёнаў БССР, 36 раённых і 2 абласныя цэнтры — Гомель і Мазыр. У раёне Азарыч войскі Чырвонай арміі ўратавалі вязняў трох лагераў смерці (больш за 33 тыс. савецкіх грамадзян).

У 1944 г. Чырвоная армія здзейсніла 10 удараў па ворагу, у выніку якіх дзяржаўная мяжа СССР была адноўлена на ўсёй працягласці ад Баранцава да Чорнага мораў. Сярод іх асаблівае месца займае разгром нацысцкіх войскаў на тэрыторыі Беларусі, які ўвайшоў у гісторыю пад кодавай назвай «Аперацыя „Баграціён“». Гэта была адна з найбуйнейшых наступальных аперацый Чырвонай арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У аперацыі ўдзельнічалі войскі чатырох франтоў: 1-га Беларускага (камандуючы К. К. Ракасоўскі), 2-га Беларускага (камандуючы Г. Ф. Захараў), 3-га Беларускага (камандуючы І. Д. Чарняхоўскі), 1-га Прыбалтыйскага (камандуючы І. Х. Баграмян) і сілы Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Каардынацыю дзеянняў франтоў ажыццяўлялі прадстаўнікі Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання — маршалы Савецкага Саюза Г. К. Жукаў і А. М. Васілеўскі.

Магутныя ўдары па камунікацыях ворага нанеслі беларускія партызаны. У ноч на 20 чэрвеня 1944 г. пачаўся трэці этап «рэйкавай вайны».




Паглядзіце фільм «Час вярнуцца» (кінастудыя «Беларусьфільм», 2024 г.). Як паказана ў фільме роля беларускіх партызан у вызваленні БССР ад нацыстаў?

## Аперацыя «Баграціён»



Як звязаныя аперацыя «Баграціён» і мемарыял «Курган Славы»?

Аперацыя «Баграціён» пачалася **23 чэрвеня 1944 г.** з наступу Чырвонай арміі на віцебскім, аршанскім і магілёўскім напрамках. За некалькі дзён былі знішчаны асноўныя сілы вермахта пад Віцебскам, Бабруйскам і Магілёвам, а 3 ліпеня 1944 г. перадавыя часці Чырвонай арміі вызвалілі Мінск.

У раёне Мінска, Віцебска і Бабруйска было акружана і знішчана 30 гітлераўскіх дывізій. На ўсход ад Мінска ў «кацёл» трапіла 105-тысячная варожая групоўка. Больш за 50 тыс. узятых у палон падчас вызвалення Беларусі салдат вермахта прайшлі пад канвоем у ліпені 1944 г. вуліцамі Масквы — гэта быў «Парад пераможаных».

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:*

1. *Месцы знаходжання помнікаў аперацыі «Баграціён» у Беларусі.*
2. *Імёны каго з герояў аперацыі «Баграціён» носяць вуліцы вашага населенага пункта, раённага і абласнога цэнтраў.*
3. *Распрацуйце свой праект помніка героям аперацыі «Баграціён». Дзе б вы прапанавалі яго размясціць і чаму?*

Да канца лета 1944 г. уся тэрыторыя БССР была вызвалена, войскі вермахта зазналі сакрушальнае паражэнне.

**4. Унёсак беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй.** У гістарычнай памяці беларускага народа Вялікая Айчынная вайна захавалася, з аднаго боку, як нацыянальная і агульначалавечая трагедыя, з другога — як прыклад масавага гераізму, трыумф сілы волі і еднасці. Беларускі народ ад першых і да апошніх дзён вайны браў удзел ва ўзброенай барацьбе: на франтах, у партызанскіх атрадах, падпольных арганізацыях.

Мужна змагаліся ўраджэнцы Беларусі і супраць Японіі, бралі актыўны ўдзел у Маньчжурскай аперацыі СССР па разгроме Квантунскай арміі.

Унёсак партызан і падпольшчыкаў

Вялікі ўнёсак у разгром германскіх акупантаў зрабілі партызаны і падпольшчыкі. Яны знішчылі каля 500 тыс. гітлераўцаў, пусцілі пад адхон больш за 11 тыс. эшалонаў, разграмілі каля 1 тыс. штабоў і гарнізонаў праціўніка. Гітлераўцы вымушаны былі адцягваць для барацьбы з імі велізарныя сілы. Больш за 140 тыс. партызан і падпольшчыкаў Беларусі былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, а 91 з іх атрымалі званне «Герой Савецкага Саюза».

## БЕЛАРУСЫ НА ФРАНТАХ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ




**Звыш 1,3 млн** беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны



**449** ушанаваныя званнем **Героя Савецкага Саюза**; чацвёра з іх — П. Я. Галавачоў, І. І. Гусакоўскі, С. Ф. Шутаў, І. І. Якубоўскі — двойчы




**Больш за 400 тыс.** ураджэнцаў Беларусі былі ўзнагароджаныя баявымі ордэнамі і медалямі

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія прадпрыемствы БССР былі эвакуяваныя ў 1941 г. Якую прадукцыю яны выраблялі для патрэб фронту ў эвакуацыі?

Сотні тысяч ураджэнцаў Беларусі працавалі ў савецкім тыле: у Паволжы, на Урале, у Заходняй Сібіры, іншых рэгіёнах СССР. Дзякуючы іх штодзённай гераічнай працы прадпрыемствы, эвакуяваныя ва ўсходнія рэгіёны Савецкага Саюза, давалі неабходную для Чырвонай арміі прадукцыю.

Нямала беларусаў удзельнічала ў еўрапейскім Супраціўленні.

Міжнародная супольнасць прызнала ўнёсак беларускага народа ў Перамогу над гітлераўскай Германіяй і яе саюзнікамі. БССР зрабілася адной з дзяржаў — заснавальніц ААН.

**5. Наступствы вайны для Беларусі.** Перамога над нацызмам у Вялікай Айчыннай вайне была дасягнута велізарным коштам. Загінуў практычна кожны трэці жыхар Беларусі.

Нацысцкія захопнікі знішчылі або вывезлі ў Германію больш за 10 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, знішчылі больш за 8 тыс. школ, нанеслі матэрыяльны ўрон на суму 75 млрд рублёў (у цэнах 1941 г.).

| Знішчана нацыстамі **больш за 3 млн** мірных грамадзян і ваеннапалонных | Сагнана на прымусовыя работы ў Германію **больш за 380 тыс.** чалавек. Многія з іх загінулі ў выніку невыносных умоў працы, нягод і катаванняў | Разбурана і спалена **209 гарадоў**, не менш за **12 868** сельскіх населеных пунктаў, не менш за **290** вёсак падзялілі лёс Хатыні |
|---|---|---|

*Вялікая Айчынная вайна стала цяжкім выпрабаваннем для народа Беларусі і разам з тым — часам праявы стойкасці, мужнасці і гераізму. Беларускі народ набліжаў Перамогу партызанскай і падпольнай барацьбой на акупаванай тэрыторыі, змагаючыся ў шэрагах Чырвонай арміі і на працоўным фронце. Захаванне гістарычнай памяці пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны — канстытуцыйны абавязак кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| 5 мая — 23 жніўня 1943 г. — Курская бітва, завяршэнне карэннага пералому ў ходзе Другой сусветнай вайны | Ноч з 3 на 4 жніўня 1943 г. — пачатак першага этапу «рэйкавай вайны» ў БССР |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Канкрэтызуйце прыкладамі тэзіс: «Барацьба беларускага народа супраць нацысцкіх захопнікаў была агульнанароднай».
2. Ахарактарызуйце кірункі партызанскага руху і падпольнай барацьбы супраць германскіх акупантаў на тэрыторыі Беларусі.
3. Якую ролю адыгралі савецкія, партыйныя, камсамольскія органы ў арганізацыі барацьбы супраць акупантаў і захаванні беларускай дзяржаўнасці?
4. Падрыхтуйце паведамленне (або прэзентацыю) аб вызваленні БССР (вашага раёна, вобласці) ад германскіх захопнікаў. Адлюструйце ў ім удзел вашых сваякоў у барацьбе супраць акупантаў.
5. Ахарактарызуйце ўнёсак беларускага народа ў разгром нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў.